ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 298 (1265) ПЯТНІЦА, 26-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Пастанова Савету Народных камісараў СССР аб складзе Савета Працы і Абароны

Савнарком СССР пастанаўляе: зацьвердзіць наступны склад Савета Працы і Абароны: старшыня т. В. М. Молатаў (Скрабін), намесьнікі старшыні тав. В. В. Куйбытаў, тав. А. А. Андрэеў, тав. Я. Э. Рудзутак. Члены: тав. І. В. Сталін, тав. Г. К. Орджонікідзе, тав. К. Е. Варашылаў, т. Я. А. Якаўлеў, т. Г. Ф. Грынько, т. А. І. Мікоян, тав. М. І. Калмановіч.

Старшыня Савнаркому СССР В. МОЛАТАУ (Скрабін).

Кірсправамі Савнаркома СССР Н. ГАРБУНОУ.

24-га сьнежня, 1930 г. Масква, Крэмль.

ЗА РАЗЬВІЦЬЦЁ СЬВІНАГАДОЎЛІ

Вырашэньне мясной проблемы праз сьвінагадоўлю, гэта—самы карэткі плях, які вызначан пяцігадовым плянам соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Соцыялістычны сэктар—савгасы і колгасы зьяўляюцца фабрыкамі, якім савецкай уладай і партыяй даручана выканаць пакавчыкі пяцігодкі па сьвінагадоўлі.

XIII-ы зьезд КП(б)Б у сваёй пастанове аб мясной проблеме вызначыў наступныя заданьні па БССР: „давесьці стада матак сьвіней у колгасах у 30-31 годзе ня менш 50000 штук а ў 31-32 годзе ня менш 75000 штук, у сьвінаводчых колгасах у 1930-31 г. ня менш 100000 штук, а ў 1931-32 г. ня менш 150000 штук. У сувязі з гэтым устанавіць наступны выхад таварных сьвіней. На 1930-31 год у савгасах—250000 штук, у колгасах—500000 штук, а ў 1931-32 годзе ў савгасах—375000 штук, а ў колгасах—750000 штук".

Каб ажыцьцёвіць гэтыя пляхавыя меркаваньні і перавыканаць іх, уся савецкая грамадзкасьць, рабочыя савгасаў, колгасьнікі і асабліва комсамольцы, ўцягваючы і бядняцка-серадняцкія пласты вёскі зараз-жа павінны ў гаспадарках соцыялістычнага сэктару па бальшавіцку арганізаваць справу разьвіцьця сьвінагадоўлі.

Ячэйкі комсамолу, сумесна з вытворчымі нарадамі, ударнікамі, брыгадамі і лепшымі рабочымі і колгасьнікамі, павінны арганізаваць масавыя заходы непасрэдна ў гаспадарцы за лепшую організацыю сьвінагадоўлі. Конкрэтныя задачы работы комсамолу па сьвінагадоўлі на сёньнешні дзень наступныя:

Праверка прыстасаванасьці сьвінарнікаў да зімовага ўтрыманьня сьвіней;

Укомплектаваньне абслугоўваючага пэрсаналу сьвінарнікаў лепшымі рабочымі, колгасьнікамі, комсамольцамі і ударнікамі;

Організацыя брыгад па сьвінагадоўлі з мэтай хутчэйшага пашырэньня стада і выкананьня пляновых меркаваньняў;

Дасканалая праверка падрыхтоўкі гаспадаркі да [illegible] дадоўлі парасят зімовых опаросаў;

Организацыя правільнага кармленьня сьвіней і прыняцьце ўсіх крокаў, каб кормы рацыянальна скарыстоўваліся ў гаспадарцы;

Вывучэньне ўсёй справы па сьвінагадоўлі гаспадарак соцыялістычнага сэктару, каб забясьпечыць выкананьне пляну і організаваць сустрэчныя пляны.

Каб выканаць пастаўленыя задачы па сьвінагадоўлі ў савгасах і колгасах, ячэйкі комсамолу павінны практычна заняцца гэтым пытаньнем, дабіваючыся, каб у сьвінарніках быў правільна наладжаны догляд і кармленьне сьвіней, правільна організавана праца. Гэтаму пытаньню зараз не аддаецца якраз належнай увагі.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена", сумесна з сьвінаводчым інстытутам, організоўвае рэгулярнае асьвятленьне ў друку пытаньняў сьвінагадоўлі, увязваючы гэтае пытаньне з практыкай сьвінагадоўлі ў гаспадарках соцыялістычнага сэктару.

Ячэйкі комсамолу павінны прыняць усе захады, каб вопыт навукі і практыкі сапраўды выкарыстоўваўся ў кожным савгасе і колгасе. Ячэйкі павінны асьвятляць праз друк і свой лепшы вопыт, каб можна было на старонках газэты «Чырвоная Зьмена» шырэй паставіць абгаварэньне сьвінагадоўчых пытаньняў.

Нам трэба дабіцца, каб наша газэта зьявілася вялікай вытворчай нарадай у БССР па абгаварэньню пытаньняў разьвіцьця сьвінагадоўлі. Гэта зрабіць магчыма, і комсамол павінен гэта зрабіць.

Навукова-дасьледчыя ўстановы і гаспадарчыя організацыі дадуць нам свой вопыт, а шырокія комсамольскія масы, сумесна з рабочымі савгасаў і колгасьнікамі, павінны пераўтварыць яго ў жыцьцё ў сваіх гаспадарках.

Комсамольскія ячэйкі на ўсе незразумелыя для іх пытаньні ў галіне правільнай організацыі сьвінагадоўлі павінны дасылаць запытаньні на імя рэдакцыі і рэдакцыя праз Сьвінаводчы Інстытут будзе даваць адказы.

Каб уся праца праходзіла плянава пры рэдакцыі ўтворана камісія, якая будзе кіраваць консультацыяй па ўсіх пытаньнях сьвінагадоўлі.

Комсамольскія камітэты, ячэйкі і комсамольцы, мы чакаем ад вас актыўнага ўдзелу ў організаванай рабоце па консультацыі і актыўнага змаганьня за палепшаньне справы сьвінагадоўлі ў гаспадарках соцыялістычнага сэктару.

„Супроць беспрацоўных выступае паліцыя"

У Лодзі зачыніліся 9 буйных фабрык. Армія беспрацоўных непамерна павялічваецца: у Англіі на 996035, у Бэрлін—Брандэнбурскай акрузе на 41662 у Лодзі—на 20000

Дэмонстрацыі беспрацоўных і інвалідаў у Польшчы і Грэцыі разганяюцца моцнымі атрадамі паліцыі

У Лодзі зачыніліся 9 буйных тэкстыльных фабрык

Супроць дэмонстрацыі беспрацоўных выступае паліцыя

ВАРШАВА, 24. *Перад сьвятам у Лодзі зачынілася 9 буйных тэкстыльных фабрык.*

Армія Лодзінскіх беспрацоўных павялічылася яшчэ на 20 тысяч чалавек. Такое-ж становішча ў другім тэкстыльным раёне—Лодзі, дзе спынілася большасьць фабрык.

Учора адбылася дэмонстрацыя беспрацоўных у Лодзі, Каменцы, Озеркове, Эгержы, Томашы і Пабяніцах.

Усюды супроць беспрацоўных выступала паліцыя.

Мобілізацыя пролетарскіх мас для барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры

БЭРЛІН, 23. У Дюсельдорфе пры ўдзеле 1.900 чалавек адбыўся першы зьезд Ніжне-Райнскай акругі па організацыі барацьбы супроць фашызму.

Прынята зьездам рэзолюцыя констатуе, што непасрэднай задачай анты-фашысцкага руху зьяўляецца масавая мобілізацыя пролетарскіх сіл для барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры. З д а к л а д а м выступіў комдэпутат тав. Мюнцэнбэрг.

Выступаўшыя пасьля яго рабочыя прадпрыемства прадстаўнікі беспрацоўных і масавых пролетарскіх організацый, а таксама прысутнічаўшыя на зьезьдзе соц. дэмократычныя рабочыя і рабочыя члены каталіцкіх саюзаў, падкрэсьлівалі неабходнасьць адзінага пролетарскага фронта для барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры.

З ліку беспартыйных дэлегатаў стыхійна вылучылася 100 рабочых, якія пры бурных овацыях усяго зьезду падалі заяву аб уступленьні ў компартыю.

Зьезд выбраў баявое кіраўніцтва ў 200 чалавек з ліку членаў акруговых анты-фашысцкіх камітэтаў.

Лік беспрацоўных у Англіі супроць мінулага году павялічыўся на 996,035 чалавек

ЛЁНДАН, 24. На 15-ае сьнежня ў Ангельшчыне налічвалася па афіцыйным дадзеных 2 мільёны 299 тысяч 592 беспрацоўных, г. зн. на 7,370 менш, чым тыдзень таму назад, на 996.035 больш, чым год таму назад.

Скарачэньне ліку беспрацоўных—зьявішча чыста часовае, якое выклікаецца звычайным павялічэньнем попыту на часовую рабочую сілу ў сувязі з калядпымі вакацыямі. Гэта ясна паказвае ЦКК тым фактам, што катэгорыя асоб, зусім пазбаўленых работы, за апошні тыдзень павялічылася на 9.000.

Рост беспрацоўя ў Нямеччыне

БЭРЛІН, 24. Лік беспрацоўных у акрузе Бэрлін-Брандэнбург за першы тыдзень сьнежня павялічыўся на 41.622, дасягнуўшы 599.120. З гэтага ліку толькі 372.500 атрымоўваюць дапамогу.

Адмаўляюцца ад зімняй дапамогі беспрацоўным і інвалідам

БЭРЛІН, 24. Нямецкае міністэрства фінансаў апублікавала дакладную запіску, у якой пярэчыць супроць прапановы комфракцыі рэйхстагу аб прадстаўленьні беспрацоўным і інвалідам зімовай дапамогі.

Аўтары запіскі імкнуцца даказаць няжыцьцёвасьць прапановы комфракцыі. Запіска зьмяшчае цікавыя данныя аб ліку тых, якія маюць гострую патрэбу дапамогі ў Нямеччыне.

Агульная колькасьць асоб, атрымоўваючых дапамогу ў якасьці беспрацоўных, пакалечаных, непрацаздольных і г. д., ці пэнсію ў якасьці інвалідаў вайны і працы, складаюць 9 з паловай мільёнаў. Калі дадаць да гэтага беспрацоўных і не атрымоўваючых ніякай дапамогі, дык агульная колькасьць дасягае 11 мільёнаў.

Сутычка паміж паліцыяй і інвалідамі ў Афінах

„Інваліды абараняліся кастылямі і палкамі..."

АФІНЫ, 23. Учора перад палацам прэм'ера Вэнізэлоса адбылася дэмонстрацыя 200 інвалідаў імпэрыялістычнай вайны, якія патрабавалі выдачы сьвяточнай дапамогі.

Адбылася сутычка паміж моцнымі атрадамі паліцыі і дэмонстрантамі. Інваліды абараняліся кастылямі і палкамі ад наступаўшых паліцэйскіх. Паранена 20 чалавек.

НІЯКАЙ ЛІТАСЬЦІ АГЭНТАМ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ—

ПАТРАБАВАНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

На контррэволюцыйную работу нацдэмаў працоўныя БССР адказваюць яшчэ шчыльнейшым згуртаваньнем сваіх шэрагаў навокал партыі Леніна, выкананьнем і перавыкананьнем плянаў ударнага кварталу і бальшавіцкай падрыхтоўкай да 3-га году пяцігодкі

Грудзьмі станем на абарону заваёў Кастрычніка

Заслухаўшы інформацыю аб контррэволюцыйнай рабоце групы нацдэмократаў выкрытай ДПУ, агульны сход комсамольскай ячэйкі сумесна з беспартыйнай рабочай моладзьдзю рымарнай фабрыкі „Усход" з вялікім абурэньнем асуджае контррэволюцыйную працу нацдэмократаў, якія рыхтавалі інтэрвэнцыю супроць СССР і патрабуе ад ураду найвышэйшай кары шкоднікаў.

Апалелы клясавы вораг хоча затрымаць пераможнае соцыялістычнае наступленьне пролетарыяту па ўсяму фронту, на рэшткі капіталістычных элемэнтаў, ліквідаваньне кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі.

Бачачы сваю блізкую пагібель, яны пад шыльдай агульна-нацыянальных інтарэсаў, рыхтавалі ўзброены напад на СССР з боку польскага фашызму і сусьв. буржуазіі.

У адказ на агіднейшую контррэволюцыйную работу нацдэмократаў комсамол і рабочая моладзь фабрыкі адказвае мобілізацыяй усіх сіл на ліквідацыю прарываў промфінпляну ўдарнага кварталу, уступленьнем ва ўдарныя брыгады, організацыяй новых комун, умацненьнем абароназдольнасьці краіны, вывучэньнем нацполітыкі компартыі і праводзеньнем яе ў жыцьцё.

Няхай памятуюць контррэволюцыйныя шкоднікі Лёсікі, Ластоўскія і інш., што сіла рабочае клясы не пераможна, што жалезнымі калёнамі ідзем у нагу з компартыяй, што мы грудзямі паўстанем на абарону Кастрычнікавых заваёў.

Няхай жыве магутная компартыя!

Няхай жыве савецкая Беларусь—непадзельная частка СССР.

Агульны сход ячэйкі ЛКСМБ.

Мобілізацыяй актыўнасьці адкажам агентам інтэрвэнтаў

Агульны гарадзкі сход моладзі гор. Гарадка ганьбіць контр-рэволюцыйную дзейнасьць нац. дэмократаў і патрабуе ад пролетарскага суда жорсткага пакараньня агентаў інтэрвенцыі.

Сход запэўнівае партыю Леніна і комсамол, што мы яшчэ больш узмацнім нашу пільнасьць і згуртаванасьць вакол генэральнай лініі партыі ў ажыцьцяўленьні бальшавіцкіх тэмпаў.

Сход зьвяртае ўвагу ўсіх організацый на няўхільнае ажыцьцяўленьне пастаноў КП(б)Б аб беларусізацыі савецка-коопэрацыйнага і гаспадарча-профэсыйнага апарату і барацьбу з вялікарасійскім шовінізмам, як галоўнай небясьпекай, контр-рэволюцыйным нац. дэмократызмам, антысэмітызмам, шовінізмамі ўсіх колераў.

Сход лічыць лепшым адказам на вылазкі контр-рэволюцыі—мобілізацыю актыўнасьці працоўных мас на выкананьне і перавыкананьне задач асобнага кварталу і падрыхтоўку да 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Прэзыдыум сходу.

Адкрылася першая агульна-гарадзкая партконфэрэнцыя гор. Менску

Конфэрэнцыя заслухала даклад тав. ГЕЯ

* *Учора, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні дому партыйнай асьветы адкрылася першая агульнагарадзкая партыйная конфэрэнцыя гор. Менску.*

* *З уступнай прамовай аб задачах конфэрэнцыі выступіў старшыня оргкамісіі па стварэньню ў Менску гарадзкога камітэту КП(б)Б тав. Кавальчук.*

* *Па прапанове дэлегацый: Чыгункі, „Бальшавіка", „Кастрычніка" „Энэргіі" „Комунара" і друкарні імя Сталіна ў склад прэзыдыуму абіраецца 41 чалавек і ў тым ліку т. т. Аксючыц, Бэнэк, Будзінскі, Гантман, Гей, Галадзед Грысевіч, Дамброўскі, Калнін, Палякоў, Рыжоў, Рапапорт, Шэранговіч, Чарвякоў, Чарнушэвіч і Янковіч.*

* *Над гучныя воплескі ўсіх дэлегатаў абіраецца ганаровы прэзыдыум у складзе т. т. Сталіна, Молатава, Кагановіча, Калініна, Орджонікідзэ, Варашылава, Куйбышава Андрэява, Тэльмана і Ленскага.*

* *Гучнымі воплескамі сустрэла заля сакратара ЦК КП(б)Б тов. Гея, які выступіў з дакладам аб выніках апошняга аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК Усе КП(б).*

КОМСАМОЛЬСКІ ЭНТУЗІЯЗМ

ПАМНОЖЫМ НА ВОПЫТ НАВУКІ

Рух да фінішу комсамольскай сьвінаводчай эстафэты ператварыць у рух шырокіх мас комсамольцаў, рабочых савгасаў і колгасьнікаў, за соцыялістычны абмен вопытам, шырокае выкарыстаньне досьледаў навукі, разгортваньне работы па вынаходзтву і рацыяналізатарству

ДАСЯГНЕНЬНІ НАВУКІ—У ПРАКТЫКУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СЭКТАРУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ



Па-ўдарнаму правесьці двухмесячнік абмену вопытам

Адозва ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня, рашэньні СНК СССР аб рэалізацыі прапаноў па вынаходзтву ставяць сваёй мэтай хуткае і поўнае выкарыстаньне ініцыятывы рабочае клясы і колгасьнікаў на выкананьне пляну ўдарнага кварталу, ліквідацыю маючыхся прарываў і ўсебаковай падрыхтоўкі для выкананьня програмы 3-га году пяцігодкі.

Выходзячы з пастаўленых задач, Інстытут сьвінагадоўлі, сумесна з цэнтральнымі ўстановамі БССР, рэдакцыямі газэт і часопісаў („Беларуская Вёска“, „Сельска-гаспадарчы рабочы“ і „Шляхі Колектывізацыі“) праводзяць двухмесячнік соцыялістычнага абмену вопытам у сельскай гаспадарцы.

Перад двухмесячнікам пастаўлены наступныя задачы:

Зрабіць даступнымі і зразумелымі для шырокай савецкай грамадзкасьці дасягненьні, якія маюць савгасы і колгасы.

Вызначыць асобныя рацыяналізатарскія спосабы тэхнікі і організацыі працы ў савгасах і колгасах, шырока разгарнуць работу па вынаходзтву ў соцыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі і популярызацыі вынікаў гэтай вытворчасьці працоўных мас.

Даць матар'ял аб перавазе буйнай соцыялістычнай гаспадаркі над дробнымі сялянскімі аднаасобнымі гаспадаркамі.

На лініі сьвінагадоўлі дапамагчы дасьледчаму Інстытуту прыстасаваць сваю програму да сапраўднага штодзённага запатрабаваньня соцыялістычных гаспадарак савгасаў і колгасаў.

Матар'ялы аб практычных мерапрыемствах гэтай работы разасланы ва ўсе раёны, а ў раёны з жывёлагадоўчым напрамкам дадаткова дан матар'ял ад Сьвін. Інстытуту. Трэ' было-б чакаць, што двухмесячнік абмену соцыялістычным вопытам будзе шырока разгорнуты ва ўсіх раёнах. На справе-ж вышла інакш. Толькі некаторыя раёны паведамілі аб тым, што ў іх распачата праца і больш ніякіх матар'ялаў з месц не дасылаюць.

У Быхаўскім раёне складзен штаб з прадстаўнікоў ад усіх зацікаўленых організацый. Але і толькі таго. Склалі штаб і на гэтым супакоіліся. Камісія садзейнічаньня, брыгады пры савгасах і колгасах, ня ўтвораны.

Яшчэ горш справа ў Рагачоўскім і Гомельскіх раёнах. Там нават ня ведаюць, што ў Беларусі зараз праводзіцца двухмесячнік па абмену соцыялістычным вопытам. Больш таго, паасобныя кіраўнікі гэтых раёнаў ня лічаць політычна важнай задачай паказаць перавагу соцыялістычнага сэктару над індывідуальным.

Гэты прарыў павінен быць ліквідаваны. Трэба да 10-І—31 году па лініі сьвінагадоўлі організаваць абмен соц. вопытам. Там, дзе ня складзены яшчэ камісіі садзейнічаньня пры савгасах і колгасах, трэба ўсе пытаньні, якія зьвязаны з правядзеньнем двухмесячніку абмену соц вопытам, абгаварыць на вытворчых нарадах, на агульных сходах рабочых і колгасьнікаў, на брыгадах і г. д.

Трэба давесьці да ведама шырокіх колаў працоўных мас сялянства аб тых дасягненьнях, якія маюцца ў соцыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі, і гэтым спрыяць яшчэ больш пасьпяховаму разгортваньню колектывізацыі і організацыі новага прыліву ў колгасы беднякоў і серадняков.

Ф. П.

Выкарыстаць вопыт комуны „Карла Лібкнэхта“

Скарыстаць на адкорм сьвіней мязгу

Шырокі размах разьвіцьця сьвінагадоўлі і ў зьвязку з гэтым недахоп кармоў ставіць у парадак дня скарыстаньне ў корм сьвіньням усіх адкідаў, як гарадзкіх сталовак, так і тэхнічных прадпрыемстваў.

З тэхнічных прадпрыемстваў с-г. маюць асабліва вялікае значэньне адходы броварных і крухмальных заводаў. Гаспадаркі на мясцох шырока ўжываюць гэтыя адкіды, але яны застаюцца невядомымі для шырокай грамадзкасьці. Таму цікава абмяняцца вопытам комуны „Карла Лібкнэхта“, Быхаўскага раёну, дзе на працягу некалькіх год сьвіньні адкармліваюцца бульбяной мязгою крухмальнага заводу.

Тэхніка падрыхтоўкі мязгі ў гэтай гаспадарцы наступная: сьвежую мязгу дастаўляюць на кухню для падрыхтоўкі корму сьвіньням, вараць яе ў катле або запарваюць гарачай вадою з такім разьлікам, каб яна была гатова к моманту кармленьня. Сырую мязгу сьвіньні ня хочуць есьці, а таксама ня хочуць есьці бяз домешкі мук, альбо бульбы. З такою домешкай прыгатаваную мязгу сьвіньні паядаюць з ахвотай. Мязга ўводзілася ўсім сьвіньням, за выключэньнем пароcных матак і парасят, па ніжэй паданым рацыёне.

Сальны адкорм—жывая вага 100-150 кілё, кармовых адзінак—3,7 кілё, мязгі—13-14 кілё, бульбы—2 кілё, збожжавай мешаніны—1 кілё.

Маткі халастыя—жывая вага 100-130 кілё, кармовых адзінак—3,2 кілё, мязгі—12-15 кілё, мякіны або сена—0,5 кілё, збож. меш.—0,8 кілё.

Падсьвінкі—жывая вага 50 60, кармовых адзінак—1,9 кілё, мязгі—6-8 кілё, бульбы—0,6 кілё, збож. меш.—0,6 кілё.

Пры падлічэньні кармовых адзінак, бялка і мінэральных соляй трэба ўстанавіць, што бялка і мінэральных соляй не хапае. Асабліва трэ'а адзначыць, што гэты корм ня мае вітамінаў. Па пажыўнай вартасьці норма здавальняючая. Пакідаючы для арыгінальнасьці гэты рацыён, яго пажадана было-б падправіць і раіць лепш у такім выглядзе:

Сальны адкорм—жывая вага 100-150 кілё—кармовых адзінак—4 кілё, мязгі—10-14 кілё, бульбы—2 кілё, мякіны альбо канюшыны—1-0,5 кілё, клубняплодаў сырых—1-0,5, збожжавай мешаніны—1 кілё.

Халастыя маткі—жывая вага 100-130 кілё—кармовых адзінак—3,2 кілё, мязгі—10-15 кілё, мякіны альбо канюшыны—1,5-1 кілё, клубняплодаў сырых—1,5-1 кілё, збожжавай меш.—0,8 кілё.

Падсьвінкі—жывая вага 50-60 кілё, кармовых адзінак—2 кілё, мязгі—6-8 кілё, бульбы—0,6 кілё, мякіны альбо канюшыны—1 кілё, клубняплодаў сырых—1 кілё, збожжавай меш.—0,6 к.

Да гэтага рацыёну неабходна дабаўляць солі. Гаспадарка мае каля 220 сьвіней белай ангельскай пароды. Маткі маюць жывое вагі ў сярэднім—200 кілё. Паросяцца маткі ў год два і больш разоў. Парасяты атрымліваюцца па 8-12 штук, зусім здаровыя і гадуюцца вельмі добра. Сальныя сьвіньні адкармліваюцца да 300 і 350 кілё. Трэба адзначыць аслабленьне касьцяка сьвіней і абвісласьць бруха. Гэта можна тлумачыць недахопам мінэральнага корму ў рацыёне і вялікім аб'ёмам рацыёну. Нерэкордны рост падсьвінкаў можна тлумачыць малой колькасьцю бялка ў рацыёне. Аўторытэтныя спэцыялісты ня раяць скармліваць мязгі больш 8-10 кілё на галаву.

Увядзеньне ў рацыён да 15 кілё мязгі на 150 кілё жывой вагі закранаюць вельмі цікавае пытаньне ў вырашэньні кармовага балянсу сьвінаводчых гаспадарак. Гэты вопыт трэба праверыць у іншых гаспадарках. Пры такім рацыёне крайне неабходна ўвядзеньне ў рацыён канюшыны і сырых караньплодаў, як вітамінных кармоў, для пасіленьня росту падсьвінкаў і палепшаньня работы страўніка. Крайне неабходна таксама ўвядзеньне ў рацыён кармоў багатых бялком, як жмых, гарохавая, альбо бабовая мука, вотрубы.

Зоотэхнік ПАРАХНЕВІЧ.

Усе сілы на вырашэньне проблемы сьвінагадоўлі

Гроская організацыя ЛКСМБ узмоцнена рыхтуецца да правядзеньня фінішу сьвінаводчай эстафэты. Для правядзеньня эстафэты ўтворан штаб з 5 асоб.

Раённы штаб выпрацаваў маршрут па выкананьню комсамолам дырэктыў партыі ў разьвіцьці сьвінагадоўлі.

Маршрут № 1

Організацыя сельска-гаспадарчай вытворчасьці па сьвінагадоўлі

а) за лепшую організацыю працы ў сьвінаводчых савгасах і колгасах,

б) падняцьце працоўнай дысцыпліны, сваечасовы выхад на працу, выкананьне і ўвядзеньне норм выпрацоўкі,

в) організацыя работы па правільнаму догляду (сваечасовая падсцілка, ацяпленьне хлева) і лепшыя адносіны даглядчыкаў да сьвіней.

Маршрут № 2

а) Выканаць пляны ўкомплектаваньня сьвінаводчых гаспадарак і організаваць сустрэчныя пляны па сьвінагадоўлі,

б) падвысіць кармовую базу і палепшыць яе (правільнае кармленьне па нормах, як карміць, якасьць кармоў і правільнае скарыстаньне адкідаў),

в) палепшыць сьвінагадоўлю шляхам набыцьця палепшаных вытворцаў, сьвінаматак, абмену вопытам працы з іншымі колгасамі.

Маршрут № 3

Выкананьне зоовэтмінімуму і барацьба з эпізоотыяй

а) Дабіцца, каб абавязкова былі адведзены памяшканьні пад карантыны і ізолятары,

б) дабіцца сваечасовага нагляду і абслугоўваньня вэтпэрсоналу,

в) пабудаваць кармушкі і сваечасова іх ачышчаць.

Для ажыцьцяўленьня намечаных мерапрыемстваў усю працу праводзіць мэтодам соц. спаборніцтва. Для падрыхтоўкі кадраў лічыць неабходным абавязкова адчыніць курсы па сьвінагадоўлі на 45 чал.

***

18-га сьнежня праведзена нарада сакратароў комсамольскіх ячэек колгасаў і савгасаў сумесна з гаспадарчымі організацыямі. Быў пастаўлен даклад аб выкананьні дзяржаўных заданьняў па сьвінагадоўлі і садаклад аб задачах комсамолу ў разьвіцьці сьвінагадоўлі і правядзеньня фінішу сьвінагадоўлі. На нарадзе констатавалі, што комсамольскія ячэйкі, а таксама гаспадарчыя організацыі не дааценілі гаспадарча-політычнай важнасьці вырашэньня проблемы сьвінагадоўлі, не мобілізавалі ў выстарчальнай меры шырокія колы батрацтва і бядняцтва колгасаў і савгасаў.

Нарада адзначыла, што комсамол прынясе рапарт Х-му зьезду ЛКСМБ, выканае ўзятыя на сябе абавязкі, удзесяцярыць тэмпы сваёй работы, пакажа вузоры бальшавіцкіх тэмпаў, абвясьціць барацьбу з закаранеласьцю, з бруднымі адносінамі да сьвіньні.

Атрадам „лёгкай кавалерыі“ дадзена заданьне правесьці масавую самаправерку 9 сьвінаводчых колгасаў і савгасаў у галіне заканчэньня будаўніцтва, укомплектаваньня і г. д.

Пасьля праверкі ў савгасах ставіцца даклад гаспадарніка і садаклад сакратара комячэйкі.

Апрача правядзеньня фінішу сьвінаводчай эстафэты ў аграмаджаным сэктары, будзе праводзіцца растлумачальная праца сярод аднаасобнікаў аб скарачэньні забою сьвінаматак, кантрактацыі сьвіней, абмену сьвінаматак на кабанчыкаў, правядзеньні зоовэтмінімуму, агромінімуму і г. д.

РК РСІ ўключыўся ў правядзеньне фінішу сьвінаводчай эстафэты па аказаньню комсамольскай організацыі практычнай дапамогі.

Конфэрэнцыя, прысьвечаная правядзеньню фінішу сьвінагадоўлі, назначана на 25-е сьнежня 30 г. На гэтай конфэрэнцыі прадстаўнікамі ад савгасаў і колгасаў, гаспадарчымі організацыямі будуць перададзены рапарты паасобных ячэек аб іх практычнай рабоце, аб здабычы вопыту і г. д.

Сімкін.

Чэрвеньцы рыхтуюцца да фінішу

Комсамольская організацыя Чэрвеньскага раёну распачала падрыхтоўчую працу да фінішу сьвінаводчай эстафэты. У раёне праводзіцца самаправерка работы сьвінаводчых колгасаў і савгасаў і ячэек ЛКСМБ праз спэцыяльна створаныя брыгады. Работа па самаправерцы праводзіцца шляхам узаемнай праверкі сьвінаводчых савгасаў і колгасаў і ячэек комсамолу.

Пасьля самаправеркі ва ўсіх сьвінаводчых савгасах і колгасах адбудуцца адкрытыя сходы ячэек ЛКСМБ сумесна з рабочымі колгасьнікамі і аднаасобнікамі, беднякамі і серадняками.

На дапамогу ячэйкам у правядзеньні работы да фінішу выслана з РК КСМ брыгада з 5 чалавек.

Фініш сьвінаводчай эстафэты адбудзецца 30-га сьнежня ў гор. Чэрвені. Да гэтага дня прыўрочваецца раённая конфэрэнцыя рабоча-батрацкай, колгаснай і бядняцка-сераднявкай моладзі. У дзень фінішу ў Чэрвені будзе ўтворана масавая сустрэча эстафэты шляхам правядзеньня дэмонстрацыі і мітынгу.

Красільшчык.

„Мы вам дамо дакладчыка і на гэтым кропка“

(Ліст з Крупскага раёну)

Сьвінаводчая эстафэта зьяўляецца сродкам мобілізацыі ўвагі савецкай грамадзкасьці на лепшы ўдзел у справе разьвіцьця сьвінагадоўлі.

У гэтым мерапрыемстве—сьвінаводчай эстафэце ўстановы Крупскага раёну да гэтага часу ўдзелу ня прымаюць, а як аднесьліся да гэтага вялізарнага мерапрыемства кіраўнікі некаторых устаноў раёну, мы ніжэй падамо факты.

Калі сакратар РК ЛКСМБ зьвярнуўся да старшыні РВК па пытаньню правядзеньня сьвінаводчай эстафэты апошні адказаў: „Мы вам дамо дакладчыка і на гэтым кропка“. Старшыня РВК не палічыў патрэбным абгаварыць гэтае пытаньне на пасяджэньні прэзыдыуму РВК.

Старшыня райколгассаюзу тав. Казлоўскі, праводзячы раённую нараду старшынь калгасаў забараніў абгаварыць гэтае пытаньне і адказаў: „дырэктыў па пытаньню сьвінаводчай эстафэты ў нас ня маецца, пагэтаму, калі жадаеце, выступайце ў спрэчках“.

А становішча з разьвіцьцём сьвінагадоўлі па раёну ня зусім здавальняючае, напрыклад, колгас „Комінтэрн“ разбазарвае сьвіней. За апошні час прададзена 12 штук падсьвінкаў.

Практычна па організацыі КСМ Крупскага раёну зроблена вельмі мала, за выключэньнем Бобарскай ячэйкі, якая праводзіць нядзельнік па ачыстцы сьвінарнікаў.

Нарада сакратароў ячэек КСМ па гэтаму пытаньню, якая была склікана на 15-ХІІ—сарвалася.

А. С.

Горкая сапраўднасьць

У шэрагу месц, ня гледзячы на халады, не пабудаваны сьвінарнікі.



СЬВІНЬНЯ: Таварыш колгасбуд! Даволі табе пісаць цыркуляры. Дай мне сьвінарнік, бо зіма-ж ўжо.

Літаратурная старонка

10 год творчай дзейнасьці А. Бязыменскага

Комсамольцы Чырвонай Прэсьні хадайнічаюць аб узнагародзе тав. Бязыменскага ордэнам Леніна



На 10-гадовы юбілей творчай дзейнасьці пролетарскага поэты **А. Бязыменскага**, які спаўняецца ў гэтыя дні, у першую чаргу адгукнуліся комсамольцы Чырвонай Прэсьні, якія прысьвецілі гэтаму юбілею асобы сход і патрабавалі на ім ад поэты даць справаздачу аб сваёй по тычнай дзейнасьці.

Тав. **Бязыменскі** адказаў на гэта запрашэньне вялікай прамовай, дзе падрабязна выказаўся аб сваіх творчых прынцыпах і даў ім палітычную мотывіроўку.

— Я шчасьлівы,—сказаў т. **Бязыменскі**,—што прышоў к літаратуры ад політыкі, ад вуліц і плошчаў, дзе тварылася рэволюцыя. Хаця ў мяне і невялікі падпольны стаж (я ўступіў у партыю ў 1916 годзе), усё-ж бальшавіком я стаў раней, чым поэтай. Да 1920 году я менш усяго думаў аб літаратуры.

Я шчасьлівы, калі мяне называюць „партыйным поэтай" і «комсамольскім поэтай". Гэта значыць, што гаворачыя аба мне не забываюць, што я—член партыі, член комсамолу, якія расьцілі і ўзгадавалі мяне.

Я прышоў да літаратуры ад партыі. Таму—ня гледзячы на ўсю спрэчнасьць і дыскусыйнасьць паасобных маіх тэорэтычных палажэньняў—маім творчым мэтодам зьяўляецца дыялектычны мэтод нашай партыі.

Калі ў 1920 годзе я ўступіў у Казанскі саюз поэтаў, а пазьней працаваў у „Кузьніцы", мае вершы насілі міжплянэтны характар, я пісаў аб Юпітэры і меней, чым на рэволюцыйнае заваяваньне Марса, не згаджаўся. Гэтае вітаньне ў завоблачных прасторах, бязумоўна, знаходзілася ў супярэчнасьці з тым, што аднačасова я быў членам „самае чалавечае і самае зямное" партыі. Вынікам гэтай супярэчнасьці быў выхад з „Кузьніцы" і організацыя РАПП.

З гэтага часу ўсю сваю творчую работу я падпарадкваю непасрэднаму ўдзелу ў жыцьці. Я сказаў сабе: няма мастакоў—звышчалавекаў, а ёсьць пісьменьнікі—радавыя ўдзельнікі будзённай рэволюцыйнай работы.

Калі я выступаў на 16 партыйным зьезьдзе, я праводзіў тую думку, што пролетарскія поэты павінны ня толькі пісаць пролетарскіх „Евгениев Онегиных", але і ўмець адгукацца на ўсе пытаньні, узьнікаючыя перад партыяй і рабочай клясай, адгукацца эпіграмамі, лёзунгамі, публіцыстычнымі творамі ў вершах.

Я працую ў публіцыстычным жанры і лічу, што гэты жанр мае права на існаваньне.

У жніўні з брыгадай „Праўды" я працаваў на ліквідацыі прарываў на днепрапятроўскіх заводах імя Пятроўскага і Леніна і на ленінградзкім заводзе „Чырвоны Пуцілавец". Я пісаў ня толькі вершы, але і лёзунгі, ня толькі ў фабрычных газэтах, але і на сернічкавых каробках. І гэта работа мне асабліва каштоўна, таму што ў ёй я бачыў злучэньне бальшавіцкай работы ў творчай галіне з бальшавіцкай работай у жыцьці.

— Я ганаруся,—закончыў сваё выступленьне тав. Бязыменскі,—тым, што белагвардзейская крытыка называе мяне „літаратурным чэкістым" і „сьпявакай сталінскіх поэтаў", я даю ўрачыстае абяцаньне ўсю сваю далейшую творчасьць прысьвяціць на тое, каб заваяваць гэтае званьне „сталінскага поэты".

* * *

Шматлюдная аўдыторыя, перапоўніўшая Дом комсамолу Чырвонай Прэсьні, адказала на гэтыя словы тав. Бязыменскага бурнымі воплескамі.

Сход пастанавіў хадайнічаць праз райком партыі аб узнагародзе тав. Бязыменскага ордэнам Леніна.

(З. „К. П.")

Брыгада поэтаў політычнага жанру

14 сьнежня ў рэдакцыі „Праўды"—па ініцыятыве тав. А. Бязыменскага—адбыўся сход пісьменьнікаў і рабочых-політгурткоўцаў, на якім быў паложаны пачатак організацыі брыгады поэтаў політычнага жанру.

На сходзе тав. Бязыменскі паведаміў, што пры „Праўдзе" ўтвараюцца літаратурныя майстэрні, дзе будуць ствараца вершы, лёзунгі, інсцэніроўкі, подпісы пад малюнкі і г. д. для кампаній, праводзімых партыяй, профсаюзамі, грамадзкімі організацыямі і г. д.

Сваю работу новастворанаяа брыгада пачала з таго, што тут-жа пастанавіла ўключыцца ў работу па перавыбарах Маскоўскага савету і абслугоўваць гэтую кампанію ўсімі відамі мастацкай продукцыі.

В. Таўлай

Ніва

„Віленшчына ахоплена голадам"
(З газэт)

Ціха калышуцца жыта палоскі,
Поўзаюць хвалі адна за адной..
— Жытца—папеха галоднае вёскі,—
Дзеткі худзенькія просяць,—
пасьпей!
Вецер-дуроньнік з калосьсем гуляе:
Клоніць—схіляе к зямліцы сырой.
— Хутка, пасьпею!—адказ
далятае.
Хутка!..—нам шэпча калосікаў
строй.
Што за раздольле галодненькім
дзеткам
Новенькім хлебам набіць жыватоk!...
Бо-ж прамінула вясна, ідзе летка—
Хлеба-ж, прызнацца, ня бачыў
раток..
— Сьпей-жа, каханае жытца—
надзея,
Радасьць ў сямейку галодных
ўнясі!
Колас худзенькі няхай папаўнее
Жытца,—галодных спасі!
Эх, пасмутнела зялёная ніва!..
Мусіць, гаротная, чуе свой лёс...
Жаўранак песьню запеў жаласьліва,
Ледзь даляцеўшую з гордых нябёс...
Ша!.. Што за мара над нівай
віднеецца?..
Ціха крадзецца рука, як злад ей..
То—капітал. Пажывіцца надзеецца.
—Што-ж астанецца з мужычых
надзей?!

3 ліпеня, 1929 г. в. Рудаўка.

Міхась Багун

Крокі ў вяках

(*З поэмы*)

* * *

...Узмах за ўзмахам...
Дружней ударым!
Напрудзім сілы
каб пот
пацёк.
Дружней, таварыш!
Сьмялей, таварыш!
Збудуем самі
Сваё жыцьцё!

* * *

У гэты бурны
І радасны
вір,
У запал
непарушнае
веры
Я —
кожную кроплю
сваёй крыві
І кожны атам
матэрыі.
Хто наш —
ня з намі?
Хто там прыстаў,
І хто
ўздыхае аб даўнім?
— Глядзеце:
у белых руках
хрыста
чорнаю сьмерцю —
браўнінг!
Рукі хрыстовыя
пахнуць крывёй
Вусны —
газаў
атрутным кашалем.
Нехта
знаёмы
хрыста прывёў
І паставіў
над краем
І над нафтай
нашымі.
Нехта
да болю
знаёмы мне
крывёй
па самае
горла
напоены,
бясьсільны
злавесна
стаіўшы гнеў,
у зброку
склікае
новыя войны.
Ночы рыдзюць...
пад бруднай нагой
тысячы сэрцаў
навек застылі,
і душаць,
душаць
заветны агонь
жахлівыя сьцены
крывавых
Бастылій.
Тут —
дні адплываюць
ў вялікія рэйсы,
там —
ночы паранены
чырваньню год
І ў зброк
выпаўзаюць
за крэйсэрам
крэйсэр,
Сьмяротныя
гірлы
навёўшы
на ўсход.
Там — нехта
да болю
знаёмы мне,
крывёю роднай
па горла
напоены,
Хвалебныя гімны
складае вайне,
рыхтуе самыя
злавесныя войны.

* * *

Узмах за ўзмахам...
сьмялей ударым!
Напрудзім сілы,
каб пот пацёк!
Сьмялей, таварыш!
Дружней таварыш!
Збудуем самі
сваё жыцьцё.

Дзяржаўны ансамбль

Пастановаю колегіі Наркомасьветы ад 1-XII—30 г. створаны дзяржаўны ансамбль беларускіх народных інструмантаў з 12 чалавек. У ансамбль увайшлі лепшыя выканаўцы на народных інструмантах: Захар, Навіцкі, Жыдовіч і інш. У сучасны момант дзяржаўны ансамбль узмоцнена рыхтуе новы рэпэртуар. Заказаны новыя рэчы композытару Аладаву, Мацісону, Шнітману і інш. Напісаны і зараз развучваюцца рэчы Аладава, Шнітмана, .ванова і інш.

Тыдзень соцыялістычнай Беларусі

У Маскве, з 3 па 10 студзеня 1931 г. будзе праведзен „Тыдзень савецкай Беларусі", прысьвечаны да чарговай сэсіі ЦВК СССР. Задача „беларускага тыдню"—популярызацыя культурных і гаспадарчых дасягненьняў савецкай Беларусі ў процівагу становішчу ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, якімі кіруе панская Польшча.

Пры прэзыдыуме Комакадэміі організаваны грамадзкі камітэт па правядзеньню „тыдню".

К пачатку „беларускага тыдню" ў Маскву прыедуць звыш 200 беларускіх політычных дзеячоў, пісьменьнікаў, навуковых работнікаў, гаспадарнікаў, рабочых і колгасьнікаў—ударнікаў БССР.

На сьвяткаваньне „беларускага тыдню" ў Маскву прыедзе 1-шы дзяржаўны драматычны тэатр БССР, польскі і яўрэйскі вандроўныя тэатры, беларуская капэля, ансамбль народных інструмантаў, 2 самадзейныя мастацкія гурткі БССР.

Урачыстае адчыненьне „тыдню савецкай Беларусі" адбудзецца 3 студзеня ў вялікай залі Комакадэміі з удзелам членаў ураду, прадстаўнікоў партыйных, савецкіх, грамадзкіх і літаратурных організацый.

На другі дзень „тыдню" будуць праведзены пастаноўкі ўсіх тэатраў, прыехаўшых з Беларусі. Рабочыя самадзейныя гурткі і капэля БССР выступяць у гэты дзень у буйнейшых рабочых клюбах Масквы.

Трэці дзень „беларускага тыдню" азнаймуецца наладжваньнем вечару сустрэчы ўдарнікаў Масквы, які адбудзецца ў Доме Саюзаў. Аналёгічныя вечары сустрэч з прыехаўшымі культурны і гаспадарчымі работнікамі БССР на працягу „тыдню" будуць праведзены пісьменьніцкімі, навуковымі, гаспадарчымі і інш. організацыямі.

Усе кінотэатры Масквы на працягу тыдню будуць дэмонстраваць беларускія фільмы.

У апошні дзень беларускага „тыдню"—10 студзеня адбудзецца ўрачыстае паседжаньне ў Вялікім тэатры з удзелам прадстаўнікоў ураду СССР і БССР, партыйных, савецкіх, грамадзкіх, рабочых і літорганізацый.

К „тыдню савецкай Беларусі" ў Доме Саюзаў будзе адчынена вялікая выстаўка, характарызуючая гаспадарчыя і культурныя дасягненьні Беларускай ССР.

К „беларускаму тыдню" Комакадэмія і ГІЗ прысьвячаюць выпуск шэрагу брошур і кніг беларускай літаратуры.

Сэкцыя літаратуры і мастацтва народаў СССР Комакадэміі ў сувязі з надыходзячым „тыднем" організуе шэраг дакладаў аб беларускай літаратуры. Першы даклад члена праўленьня БелАПП т. Сянькевіча „Клясавая барацьба ў сучаснай савецкай літаратуры" з садакладам т. т. Канакоціна і Галавача адбыўся 10 сьнежня ў вялікай залі Комакадэміі.

Сэкратарыят ФОСП рашыў уключыцца ў агульную работу па падрыхтоўцы правядзеньня „беларускага тыдню". У грамадзкі камітэт пры Комакадэміі вылучан прадстаўнік ФОСП тав. Белбей. Сэкцыі перакладчыкаў ФОСП даручана загатовіць шэраг перакладаў твораў беларускай літаратуры. Будзе організавана выстаўка беларускай літаратуры, якая зьявіцца адным з аддзелаў агульнай выстаўкі культурных і гаспадарчых дасягненьняў Беларускай ССР, адчыненай у Доме Саюзаў.

У Менск выехалі прадстаўнікі ФОСП для правядзеньня падрыхтоўкі да „тыдню".

Кр.

П. Мяцельскі

КОЛГАСНАЯ ПЕСЬНЯ

Паглядзі на лугі на палеткі,
Як цьвіце індустрыйная рань,
З кожным днём усё больш прыкметна,
Вырастае, мацнее мой край.
Тут, дзе ўвечары
ў хвалях рунёвых
Промень сонца блiскучы пагас,
Вырас, вырас магутны,
Жыцьцёвы...
Малады, кучаравы колгас.
І вітае машынамі раньне,
Калі сонейка пераяслом
Вяжа ноч па шырокіх палянах,
І махае над зврочным сялом.
Ужо поле арэ трактар-волат,
Аганяючы кроплі расы,
І бічамі зьвісаюць да долу
Залатой збажыны каласы.
І калосяцца буйныя нівы,
Ткуць няэнаны узор хараства,
Ах, зарніцы жыцьця-колектывы!
Ад душы прывітаю я вас.

к-с „Чырвоны маяк"

Мастакі БССР на пераломе

Пастанова аб'яднанага пасяджэньня сэкратарыяту БелАПП і Цэнтральнага Бюро РОМБ'у, зьяўляецца новым этапам у жыцьці нашага выяўленчага мастацтва.

Пашырэньне сфэры ўдзелу мастакоў у рэконструкцыі нашага жыцьця, захапленьне соцыяльным зьместам нашай эпохі ўзрастае ад сувязі з шырокімі рабочымі масамі, з перадавым вучасткам суседняй галіны мастацтва—з беларускай пролетарскай літаратурай.

Сувязь з рабочымі масамі дапаможа мастакам БССР знайсьці новыя сродкі і формы творчасьці, адарве іх ад затхлых уплываў нацыянал-дэмократаў, якія ўнесьлі ў мастацтва дробна-буржуазны гістарызм і стылізатарскія тэндэнцыі. Яна таксама адарве іх ад формалісцкіх уплываў буржуазнага францускага мастацтва.

Апошнія мастацкія выстаўкі падкрэсьлілі, што нашы мастакі адыходзяць ад старых тэм і старога матар'ялу. У іх працах ужо адчуваецца характарыстыка нашай краіны, якая ідзе па шляхох індустрыялізацыі і колектывізацыі.

Аднак, толькі шчыльная спайка з рабочымі масамі і з атрадам пролетарскіх пісьменьнікаў БССР дапаможа ім яскрава акцэнтаваць гэтыя тэмы ня толькі ў сэнсе выбару сюжэту, але і ў самай мэтодолёгіі вобразнай творчасьці, у адшуканьнях новай соцыялістычнай стылёвай устаноўкі.

У гэтым сэнсе сувязь з фабрыкамі і заводамі будзе стымуляваць унясеньне ў работу мастакоў тых мэтодаў, якія дапамагаюць рабочай клясе змагацца з цяжкасьцямі—гэта мэтоды ўдарніцтва і соцспаборніцтва.

Праца з рабочымі будзе спрыяць высоўваньню новых пролетарскіх мастацкіх кадраў, так неабходных для ўнясеньня клясавай імкненасьці і стварэньня новага пролетарскага стылю.

Проблемы, якія ў сучасны момант стаяць перад вобразным мастацтвам: выкарыстоўваньне старое спадчыны, сувязь варштатнага мастацтва з вытворчым, проблемы формы і зьместу і г. д.—могуць быць вырашаны толькі ў сьвятле задач, якія стаяць перад рабочай клясай.

Таму гэтыя задачы павінны быць ясны ўсім мастаком, для якіх пытаньне політычнага выхаваньня ў сувязі з новым этапам павінна стаць на першы плян. **Кастэлянскі.**

3. ФАБРЫКА ХЛУСЬНІ І ЦЕМРЫ

Міх. Варнікоўскі

Нарысы пра Кіева-Пячэрскую Лаўру— цяперашні Ўсеукраінскі Музэйны Гарадок

Напэўна, з турбы цэркваў і муроў Лаўры, найбольшую цікавасьць уяўляе так званая Галоўная Усьпенская царква.

У яе тоўстых, старых сьценах, густа аздобленых шматлікімі малюнкамі з жыцьця „сьвятых“, захавана шмат крывавых забойстваў працоўных, працята, перабытана для многіх у загадку, бясконцая стужка жудасных спраў манахаў і царату. Яе халодная падлога да цяжарнасьці напілася людзкое крыві і пакутных сьлёз.

Калі-б не пахіліла крыжы Лаўры завіруха Кастрычніка, яшчэ доўгадоўга нажыралася-б людзкою крывёю гэтая падлога, яшчэ доўга-доўга гістарычна рагатаў-бы кармазынавай крывёю ашалелы нож кіеўскага мітрапаліта, яшчэ доўга-доўга панурыя сьцены Лаўры захоўвалі-б у сваіх каменьнях нікому невядомыя, нязнаныя распусту і бруд, жудасьць і трагэдыі, якія тварылі агідныя манахі на чале з сваім ня менш агідным „богам“.

Калі трапляеш у гэтую царкву і бегла аблятаеш позіркам яе сьцены, падлогу, рэчы, мігам упэўніваешся, што ўсё тут зроблена надта старанна, кемна, хітра, дакладна. Усё, да драбніц, збудавана, бязумоўна, для насаджэньня рэлігіі. Але, ведаеце, не па біблії, не па эвангельлю, а па... самаму апошняму слову тэхнікі.

Гэта ў рэлігіі якраз ня цуда. Ідэолёгі рэлігіі нічога не пашкадуюць, яны ахвотна аддадуць усё, абы ня ўкралася ўпушчэньне, ці то ў нязначнай рысцы на іконе, рэчы ў царкве,— якое-б магло навеяць на іх набожны „статак“ думкі пра шлях да бязбожніцтва...

І таму зусім нядзіўна, калі людзі ў рызе, даводзячы, што сьвет створаны богам, нахабна і бястурботна напяльваюць на гэтага „бога“ для многіх незразумелую, ашаламляючую таўшчэзную вопратку тэхнікі, каб рэлігійнае вока было паслухмяным богу, каб яно не затрапятала ў ліхаманцы калі выпадкова—ай, ай, барані, божа! —убачыць за гэтай навяваючай спуд вопраткай, што ніякага „бога“... няма.

Гэтая лёгіка рэчаў даволі простая. І таму на зацікаўленым твары музэйнага наведвальніка доўга коўваецца сакавітая іронія, лунае грэблівая ўхмылка. Яго больш ня пужае, ня дзівіць неймаверны бляск электрычных лямпаў, мноства намаляваных на сьценах таленавітаю рукою абліччаў „сьвятых“ і размаітых, дужа таемнага, сэнтымэнтальнага выгляду, рэчаў...

Варта пашавоіць вуснамі, як праказанае слова раптам узьлятае пад высокую столь, мігам ператвараецца ў грозна-шумлівую паводку, і, калыхаючы смуроднае паветра, расплываецца ды раскідваецца драбнюткімі кавалкамі па царкве.

Гэты, такі рэдкі і такі ёмкі рэзоланс, таксама не выклікае зьдзіўленьня. Рэзоланс, таксама быў зброяй „багабойных“ манахаў, архідыяканаў і мітрапалітаў, калі яны паважна і хлусьліва апавядалі сваім парафіянам пра таго-ж „бога“..

На падлозе, адна ля аднэй, парастаўлены цёмначырвонага колеру, па паўтара аршыны ўвышкі, пузатыя, запячатаныя лякам скарбонкі. На кожнай з іх напісана па-славянску: „Ахвяруйце“ на тое, „ахвяруйце“ на гэтае—не пералічыш колькі навыдумляна такіх „ахвярваньняў“. Як бачым, і тут—па апошняму слову „тэхнікі“...

Ня гэтак даўно на падлозе аб якую доўгі час у імя „бога“ біліся людзкія ілбы, зьявіліся зашкеленыя сталы з надзвычайна багатым лаўравым архівам. За абліччы „сьвятых“, размалёваных па сьценах, цэпка ўчапіліся красамоўныя дыяграмы, табліцы пра жудаснае мінулае Лаўры...

Я хуценька, заклапочана перагортваю архіўныя дакуманты, бегла акідаю позіркам табліцы, дыяграмы, усю царкву... Перад мною паўстае вялікае, трухлявае страшыдла—мінулы, вірзрынуты лад, шпарка і неадчэпна вырастае ў вачу кожным зьвяном сваім вялікі, разьбіты рэволюцыяй ланцуг гнілой гісторыі Лаўры...

... 230 рублёў пэнсіі атрымліваў у дзень кіеўскі мітрополіт, — рублёў, гвалтам адабраных у працоўчых.

... У 1782 г. Лаўра ўладала 55895 чалавек прыгонных сялян. Гэтай Лаўры даравалі... людзей, зямлю. Гэтая Лаўра сама гвалтоўна прыводзіла да пакоры тысячы працоўных, сілком а бірала ў іх апошні кавалак зямлі, апошнюю худобу і усё гэта—у імя таго-ж „бога“.

... Гандаль абразамі ў 1913 г. даў Лаўры 158454 руб. прыбытку.

...За 1899 г. прагныя сытыя твары вынялі з размаляваных „сьвятымі“ скарбонак 250020 руб.

... Усяго лаўраўцы за адзін толькі 1913 г. сабралі 1256804 руб.

... І плюс да гэтага—на 1 студзеня 1913 г. Лаўра мела ў банку так званы незачэпны капітал у 2725528 руб. 86 кап.

Страшэнныя лічбы! Лічбы бясконцых жахаў, бясконцых пакут працоўных. Лічбы агіды і пралітай рабочае крыві... лічбы мерцьвякоў і бессаромнай нахабнай хлусьні... „Тэхніка“, хлусьні і дурману нізавошта карала тысячы, сотні тысяч людзей, якія чакалі дарэмна, што „бог“ дасьць збавеньне ад цяжкога, паднявольнага жыцьця пры царызьме.

... І плывуць—расплываюцца шырокай паводкай крыві гэтыя лічбы. Цяжка экскурсанту стрымаць сябе, каб ня выдаяцца. Частыя экскурсанты—госьці Музэйнага Гарадка выходзяць з Лаўры яшчэ больш узброенымі для барацьбы супроць рэлігіі — барацьбы за соцыялізм. Сапраўды, ёмкая зарадка!

... Іншы раз здаецца, што па царкве ачмурэлым кажаном носіцца вострыя пах крыві, яшчэ вільготны, яшчэ сьвежы. Гэты пах балюча казытае нутро, узьнімае страшэнную буру пачуцьцяў, душыць гострымі спазмамі горла і шпарка-шпарка налівае нутро абурэньнем, рашучасьцю, нараджае нянавісьць.

Але гэтая сьцяна ўжо гучнай моваю гаворыць пра непераможны рух і волю вызваленага пролетарыяту:

„П'ятирічку—у 4 роки“

... Галоўная Усьпенская царква пабудавана ў XI стагодзьдзі. Стэрэла царква ад старых стагодзьдзяў. Бурылася. Рамантавалі. Некалі царква згарэла. І яе гарачае, разьюшанае полымя растрэсла—раскідала іскаркі недаўменьня: „Царква згарэла, І як гэта бог дапусьціў да такога няшчасьця?!“

Але сьпешна ўзносілі сьцены, старанна гасілі параскіданыя „д'яблам“ іскаркі... Вабілі. Клікалі. Хлусілі... Прагна хапаліся за „тэхніку“... І ў царкву ішлі, ішлі вялікімі натоўпамі, ішлі таму, што жандарскі абсац прымушаў верыць ў „цара і бацькаўшчыну“.

... У 1893 годзе гэтая брыдкая бабулька ізноў заенчыла, агідна агалілася. З яе цела паападала струхлелае пярэстае ўбраньне—жываніс. Цела патрэскалася і... Зноў сьпешны рамонт. 28 мая гэтага 1893 году Духоўны Сабор ухваляе напісаць на сьценах царквы малюнкі, вытрыманыя ў візантыйскім стылі XI-XII стагодзьдзяў.

Аляксанд III, па просьбе Духоўнага Сабору, выводзіць свае закагулькі:

„Согласен. Надеюсь, не будут слишком фантазировать“.

Гэта азначала, што цар горача паціскае руку кіеўскаму мітрополіту, дае яму грошы на „боскую“ справу. Гэта царава міласьць разам з тым гучэла і суровай перасьцярогай, папярэджаньнем—быць асьцярожным, не фонтазіраваць у малюнках, якія будуць размалёўваць на сьценах царквы, каб потым тысячы веруючых адбівалі паклоны. І гэта, нарэшце, азначала, што сам цар, сваёю ўласнаю рукою будаваў гэтую фабрыку хлусьні і цемры.

Пагадзіліся з славутым у тую пару мастаком Верашчагіным. Гэтаму цікаваму баталістаму давялося цяжка працаваць. Маляваць вайсковыя парады, бойкі, паходы - адно, маляваць сьвятых—справа цяжэйшая.

Як-жа іх маляваць? Вясёлымі, жыцьцярадаснымі?—Забаронена. Маляваць разбэшчанымі крывапіўцамі? Ды гэта-ж не адпавядае эвангельлю. Тагды-ж разьбягуцца, зьнікнуць гэтыя палоньнікі рэлігіі,.. Якую галаву, які твар, ногі, адзеньні, якія фарбы пакласьці „сьвятым“?

Верашчагіна прымушалі па некалькі раз перарабляць аблічча сьвятых. Ён нэрваваўся, злаваў, покуль ня „вымучыў“ трыста лікаў „сьвятых“ і два малюнкі і покуль не атрымаў за першыя—200000 рублёў і за другія—100000 рублёў...

Падыходжу да „дарахраніцельніцы“ і пачынаю яе разглядаць. Мне тлумачаць, што гэтая „дарахраніцельніца“ —з чысьцюткага срэбра, што яна важыць 105 фунтаў і што яе падараваў лаўры, расчулены яе „боскім“ нутром фабрыкант Анціп Іванавіч Кузьмічоў.

Я гляджу не яе і бачу марку памянёнага фабрыканта і яшчэ нейкі надпіс.

„Яснавяльможны“ Анціп Іванавіч нават не пасароміўся на гэтай рэчы, збудаванай з шматлікіх гаротных капеек працоўных, вырубіць сваё крывавае імя! Я ўзьнімаю руку, каб...

Тлумач ухмыляецца і качае галавой...

— Рукамі не чапаць!

Яго ветлая ўхмылка пералятае па мае вусны.

(*Працяг будзе*)

№-скі Стаўропальскі полк вітае БДТ-2 з новымі посьпехамі

Далей, да перамог

23-га сьнежня Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр даў паказ „Першая Конная“ падшэфнаму чырвонаштандартнаму стаўропальскаму палку. Пасьля паказу колектывам БДТ—2, працаўнікам Менскага Дзяржаўнага Тэатру ад імя палку быў перададзен адрас, у якім байцы начальніцкі склад і парт. арганізацыі шлюць сваё чырвонаармейскае прывітаньне колектыву БДТ—2 і вітаюць тэатр з перамогай на фронце пролетарскага мастацтва.

Колектыў заверыў, што і надалей ён будзе трымаць цесную сувязь з Чырвонай Арміяй і калі прыдзецца, будзе сумесна з Чырвонай Арміяй абараняць краіну саветаў. Як і дагэтуль тэатр будзе рабіць усё ад іх залежачае, каб выхаваць культурнага сьвядомага байца, які-б ведаў чые ён будзе абараняць інтарэсы ў будучай бойцы, якую рыхтуюць супроць СССР—бацькаўшчыны працоўных— імпэрыялістыя.

Перадача адрасу прашла з вялікім уздымам, усе былі рады, што паміж Чырвонай Арміяй і працаўнікамі культурнага фронту існуе цесная, здаровая сувязь.

Падшэфнік.

Колектыву Беларускага Другога Дзяржаўнага тэатру

Байцы, начальніцкі склад і партарганізацыя Н-га кавалерыйскага Стаўропальскага чырвонаштандартнага палка пасылаюць сваё чырвонаармейскае прывітаньне ўсяму колектыву БДТ—2 і вітаюць яго з перамогай на фронце пролетарскага мастацтва—з пасьпяховай пастаноўкай „Першая конная“, якая ў момант насоўваючайся ваеннай небясьпекі супроць Савецкага Саюзу мобілізуе ўвагу працоўных Савецкай Беларусі да яшчэ большага ўмацаваньня сувязі з Чырвонай Арміяй і падвышэньня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

Мы з задавальненьнем адзначаем, што 2-гі Белдзяржтэатр за час свайго культшэфства над нашым палком узяў правільную лінію, паказваючы палку ўсю сваю творчасьць, якая адбівае гэроічную барацьбу рабочае клясы пад кіраўніцтвам УсеКП(б) за ўмацаваньне Кастрычніцкіх заваёў і будаўніцтва соцыялізму, чым і спрыяе ўмацаваньню баявой магутнасьці палка,—яго рэволюцыйнай загартаванасьці.

Мы ўпэўнены, што ўзятая лінія культшэфства над палком колектывам 2-га Белдзяржтэатру будзе яшчэ больш умацоўвацца на падставе генэральнай лініі партыі і спрыяць яшчэ большай спайцы паміж Чырвонай Арміяй і працаўнікамі пролетарскага мастацтва.

За ўсю вашу работу па культурнаму абслугоўваньню палка мы вам выказваем нашу чырвонаармейскую удзячнасьць.

Няхай жыве моцная сувязь Чырвонай Арміі з працоўнымі Савецкага Саюзу і работнікамі мастацтва!

Няхай жыве УсеКП(б)—правадыр і організатар перамог Чырвонай Арміі і соцыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве КП(б)Б—правадыр організатар соцыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі!

Камандзір №-скага кавалерыйскага Стаўропальскага чырвонасьцяжнага палку.

Ваенком палку.

Адсэкрат УсеКП(б) №-га Палку.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Нарада па пытаньню дзіцячага комуністычнага руху

1 студзеня 31 г. у Менску адчыняецца Ўсебеларуская партыйна-комсамольская профсаюзная нарада па пытаньню дзіцячага комуністычнага руху, з наступнай абвесткай дня:

1) Даклад аб становішчы ДКА Беларусі (ЦК ЛКСМБ—(Гайдукевіч);

2) Даклад ураду аб удзеле дзяцей у соцбудаўніцтве і салаклад НКА аб рабоце ў школе (ЦВК, НКА);

3) Даклад ЦСПСБ аб рабоце профсаюзаў сярод дзяцей (ЦСПСБ). Пастановай сакратарыяту ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, НКА месцы разьмеркаваны наступным парадкам:

Бабруйск: Адно месца—РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.—Завкому, 1 м.—Дрэваапрацоўчаму Комбінату; Барысаў: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м.— Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.—П-К. „Бярэзіна“; Віцебск: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м. —Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, па 1 м.—П К КП(б)Б з-ду „Чырвоны Мэталісты“ і „Дзьвіна“; Ворша: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м.— Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.—важатаму базай чыгуначнікаў; Гомель: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.— Сэкратару П-К „Сельмашстрой“, 1 м. — Колектыву КП(б)Б чыгучачнікаў; Магілеў: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету, 1 м. — прадстаўніку колектыву КП(б)Б „Магвалакнобуду; Полацак: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.—колектыву КП(б)Б чыгуначнікаў; Рогачоў: 1 м. — РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету; Рэчыца: 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.—колектыву КП(б)Б запалкавай фабрыкі; Слуцак: 1 м. РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету; Горкі: 1 м.—настаўніку; Жлобін: 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—настаўніку, 1 м.—сэкратару яч. колгасу „Расьсьвет Пераможца“, 1 м.—партколектыву чыгуначнікаў; Мазыр: 1 м.—РК КП(б)Б, 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—настаўніку; Калінавічы: 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—настаўніку; Койданава: 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—настаўніку; Сянно: 1 м.—РІНАсьветы; Асіпавічы: 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—настаўніку; Быхаў: 1 м.—партколектыву лесазаводу, 1 м.—настаўніку; Дрыса: 1 м.—важатаму колгасным адрадам; Глуск: 1 м.—Райпрофсавету; Капыль: 1 м.—Райпрофсавету; Коханава: 1 м.—Райпрофсавету; Парычы: 1 м.—Райпрофсавету; Пухавічы: 1 м.—РІНАсьветы, 1 м.—Райпрофбюро; Копыль: 1 м. Райпрофбюро, 1 м.—РІНАсьветы; Бярковіцкі: 1 м.—Райпрофбюро; Житкавічы: 1 м.—Раінспэктарыяту; Крупкі: 1 м.—Райпрофбюро; Крычаў: 1 м.—Райпрофбюро, 1 м.—партколектыву цэмэнтнага заводу; Старобін: 1 м.—Райпрофсавету; Амсьціслаўль: 1 м.—Райпрофсавету, 1 м.—РІНАсьветы; Пясчаніцы: 1 м.—настаўніку; Хойнікі: 1 м.—настаўніку; Гомоль-вяковы: 1 м.—настаўніку, 1 м.—Райпрофсавету. На нараду выклікаюцца ўсе старшыні райбюро ДКА.

Менск: Гарком КП(б)Б—2 месцы, усім ЦП Саюзаў па 1 месцу, ЦСПСБ —5 м., НКАсьветы—5 м., Гарінспэктарыят—3 м., па 1 месцу наркоматам; НДІ пэдагогікі—1 м. НДІ Сельгас 1 м. НДІ Працы 1 м. Ад прадпрыемстваў: Абутковая ф-ка, Хлебазавод, Беларусь, Пролетары, Полымя Рэволюцыі, ф-ка Комунарка, Чырвоная Зорка, з-д „Д. А.“, Белдзяржбуд, Эльвод, Энэргія, Кастрычнік, Бальшавік, Чыгунка—па 2 месцы на кожнае прадпрыемства.

Усе дэлегаты павінны зьявіцца 1-га ў ЦК ЛКСМБ ад 10 гадзін да 4 гадзін за атрыманьнем мандатаў і матар'ялаў.

ЦК КП(б)Б **Гантман**
ЦК ЛКСМБ **Гайдукевіч**
ЦСПСБ **Рыжоў**
НКАсьветы **Ошэроў**

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599